# Народныя святы і абрады. Зімовы цыкл



# Зімовы цыкл

## Каляды

Каляды – адно з самых містычных святаў у старажытных славян. Яно менш звязана з сельскагаспадарчым цыклам, а больш з будовай і рухам сусвету. Першы дзень Калядаў – дзень, у які даўжыня светлавога дня пачынала павялічвацца пасля зімовага сонцастаяння, звычайна прыходзіўся на 23-24 снежня па сучасным стылі, лічыўся пачаткам астранамічнага Новага года. У адрозненні ад сельскагаспадарчага Новага года, каторы з'яўляўся пачаткам працы ў полі, на Каляды "нараджалася новае сонца", час "паварочваўся на вясну". Новае сонца ўвасаблялася ў вобразе дзіцяці, выкрадзенага лютай вядзьмаркайЗімою, каторая ператварыла яго ў ваўка. Але светлыя сілы, вядома, перамагаюць, гарачыя промні маладога сонца спальваюць ваўчыную скуру, яно вызваляецца з палону цёмных сіл і пакрысе "сталее", з кожным днём набіраючы сіл да вясны.

Само слова "Каляды" мае паходжанне ад лацінскага calendae, "календы" - назва першага дня кожнага месяца (ад таго кораня пайшоў і "каляндар"), а таксама ад старажытнай назвы сонечнага дыску – Кола. Да Каляд абавязкова адказна рыхтаваліся. Прыбіралі хату, убіралі яе самаробнымі ўпрыгожваннямі, рабілі, калі быў патрэбны, рамонт усіх гаспадарчых будынкаў на падвор'і. Да Калядаў стараліся пашыць новае адзенне, абавязкова памыцца ў лазні. Новы год і новае сонца непрыгожа сустракаць, калі непарадак у гаспадарцы ці ў душы. Вось і зараз стараюцца людзі да новага года дарабіць пачатыя справы, разлічыцца з пазыкамі, прыбраць жыллё. А вось замест звычайнай у нашы часы навагодняй яліны асноўным упрыгожаннем хаты таго часу быў сноп збожжа, які уносілі у хату ў першы дзень Каляд і трымалі там да апошняга. Замест снапа магла быць і саламянаялялька, якая ўяўляла сабой нованароджаны год.

Каляды – свята вясёлае. Асаблівы святочны настрой стварала, мабыць, і тое, што да пачатку работ у полі – самы цяжкі час для нашых продкаў – было яшчэ далёка. Нават больш – на Каляды нельга было рабіць ніякую працу, ані ткаць, праць, рыхтаваць дровы – можна было толькі весяліцца, каб падтрымаць сілы святла сваім настроем ды задорам. Працягваліся Каляды прыкладна 2 тыдні, да Вялесава дня. Асаблівае месца ў святкаванні Каляд адводзілася абрадаваму сталу і святочным стравам. Стол, вядома, павінен быць багатым, каб наступным годам мець добры ўраджай і здароўе дзеля людзей і жывёл. Пад абрус на стол клалі сена, каторае пасля вячэры скормлівалі каровам, што павінна было зберагчы іх ад ваўкоў і паспрыяць павелічэнню надоеў малака. У

кожнай, нават самай беднай, хаце на каляды даставалі з схованак мяса ды каўбасы, сала, арэхі, яблыкі, мёд. Ад галоўнай стравы Калядаў – куцці (ячневая каша з дабаўленнем мёду, арэхаў, ягад) – узялі назву тры абавязковыя святочныя вячэры. У першы дзень ладзілася "посная куцця" - на стале былі стравы з рыбы, агароднiны, грыбоў, сушанай садавіны, мёду, і, канечне, тая самая ячневая каша-куцця з мёдам. Варылі яе таксама незвычайна, а другой гадзіне ночы старэйшая жанчына ў сям'і ішла ў свіран за зернем, а старэйшы мужчына – па ваду. Ваду і зерне нельга было чапаць да таго моманту, як будзе гатова печка. Нарыхтаванай такім чынам куцці надавалася асаблівае магічнае значэнне, яна павінна была надаваць усім здароўя, моцы, удачы. Пачынаў вячэру, як звычайна, гаспадар, акрамя таго, за стол так ці інакш запрашаліся ўсе продкі. Рэшткі куцці падкідвалі пад столь, каб ячмень наступным годам урадзіў высокі. Пасля гэтага крупы скормлівалі хатнім птушкам. На асобнай талерачцы была і каша дзеля Зюзі, зімовага бога, каб улагодзіць яго, бо маразы ў перыяд Каляд былі, бадай, самымі моцнымі за ўсю зіму. Гэты даволі распаўсюджаны звычай захаваўся ў некаторых краінах і па сённяшні дзень - традыцыя ставіць на Новы год за акно талерачкі з зернем.

Другая куцця, тоўстая, багатая, шчодрая – ладзілася праз тыдзень. Як вынікае з назвы, у гэты вечар на стале былі стравы з мяса разнастайных гатункаў – варанага, смажанага, печанага, каўбасы, вяндліны, куцця са шкваркамі.Трэцяя куцця прыходзілася на канец святочнага тыдня, Вялесаў дзень, і называлася "вадзяная". Магчыма, такую назву яна атрымала пазней, ужо ў хрысціянскія часы, таму што супадала з царкоўным святам вадохрышча. Але ёсць верагоднасць, што за два тыдні святкавання ды набівання страўнікаў, запасы значна памяншаліся і каша на вадзе – бадай, адзінае, чым можна было частаваць гасцей пад канец Каляд.

Немагчыма ўявіць сабе Каляды без містрэрыі. Яна пачыналася ў першы ж дзень і скончвалася апошнім. У час зімовага сонцастаяння, як і астатнія такія ж даты, дзеля нашых продкаў адчыняліся дзверы паміж светам існасці і мроі, жывых і памерлых, усё было прасякнута чароўным і небяспечным духам таямніцы. Час лічыўся спрыяльным дзеля ведзьмароў ды нячысцікаў,што насылалі на зямлю траскучыя маразы, але ж таксама і дзеля варажбы, заклёнаў ды абярэгаў. Для беларусаў гэтае спрадвечнае свята і да сённяшняга дня заўжды застаецца радасным, велічным і аптымістычным. На Каляды, асабліва ў першы вечар, прынята было збірацца разам, усёй сям'ёй, прычым запрашалі на святкаванне не толькі жывых членаў радзіны, але і продкаў. Лічылася, што яны разам з усімі садзяцца за стол, і калі спадабаецца ім вячэра – абавязкова "замовяць слоўца" і дапамогуць жывым ва ўсіх істотных справах.

Нельга не узгадаць і пра “калядаванне” – адну з самых яркіх традыцый, што дайшла да сучаснасці. Лічылася што толькі вяселле, шумлівыя гулянні могуць напалохаць злыдняў, павылазіўшых з таго свету, ды аберагчы людзей ад іх. Моладзь збіралася разам, пераапраналіся ў строі істотных татэмных жывёл (мядзведзя – увасабленне Вялеса, карову, казу, каня – сімвала дастатку, багацця, бусла – што лічыўся талісманам удачы, ладу) і хадзілі па хатах, спяваючы калядныя песні з пажаданнямі ўсяго лепшага, услаўляючы сілы святла і граючы на музычных інструментах. Чым часцей узгадваліся розныя магічныя формулы, тым больш дзейснымі яны лічыліся. Гаспадары ж, каторых яны наведалі, давалі ў падзяку за абарону ад нячысцікаў розныя прысмакі. Часцей за ўсё гэта былі арэхі, семачкі, пернікі і печыва, сухафрукты, пазней – цукеркі. Гэтая ежа лічылася ахвярай, каб заручыцца іх дапамогай. Адмовіць калядоўшчыкам у пачастунках было тое самае, што наклікаць на сябе няміласць усіх татэмных жывёл, пазбавіць сябе дабрабыту на ўвесь наступны год. З поўнымі мяшкамі пачастункаў калядоўшчыкі збіраліся ў адным месцы, у вялікай хаце ці на вуліцы, дзе разам “прыгаворвалі” дары, палілі вогнішчы, спявалі ды танчылі ўскруг іх, каб сваёй бадзёрасцю і ўзнятым настроем дапамагчы светлым сілам атрымаць перамогу над цёмнымі. Ну і каб сагрэцца, канечне, бо надвор’е стаяла халоднае.

Ад той пары і да сёння захаваўся звычай ладзіць маскарад на Новы год, абменьвацца падарункамі, вадзіць карагоды. Пераапрананне ў маскі мела не толькі рэлігійнае значэнне, але і псіхалагічнае. Чалавек, апрануўшы маску, ужо лічыўся быццам не самім сабою, і мог дазволіць сабе шмат больш, чым прыпісвалі строгія парадкі, асабліва ў часы хрысціянства.

А яшчэ на Каляды абавязкова варажылі. З першай куццёй – на ўраджай, а пасля – на жаніцьбу ды прыплод хатняй жывёлы – каго што больш цікавіла. Кідалі на дарогу чаравікі, пыталіся імёны, лілі воск у сцюдзёную ваду, а самыя смелыя хадзілі варажыць у лазню.

Вельмі распаўсюджанымі былі ў гэты час “жартоўныя” жаніцьбы, своеасаблівыя гульні, якія мелі мэтай пазнаёміць моладзь, стварыць спрыяльныя абставіны дзеля стасункаў. Прыкладам такога роду гульняў з'яўляюцца аналагі “ручайка”, усе магчымыя “даганялкі” хлопцамі дзяўчат, “баяры” і іншыя. У атмасферы гульні, “несапраўднасці”, гумару моладзь знаёмілася ды разбівалася па парах значна ахвотней, і вельмі часта здаралася, што складзеныя падчас калядных гульняў пары летам ці пад восень ладзілі сапраўднае вяселле. У некаторых мясцінах ладзілі адмысловы “конкурс прыгажосці”. “Міс Каляды” звычайна станавілася самая тоўстая маладуха, якая ўвасабляла сабой шчодрасць, багатую колькасць ежы і ўвогуле багацце, здароўе.

Другі дзень Каляд традыцыйна лічыўся днём, калі заканчваўся тэрмін службы наёмных работнікаў. У гэты дзень гаспадар расплачваўся з работнікам, яны абменьваліся ўражаннямі адзін пра аднаго, выказвалі, калі тыя былі, сваю незадаволенасць і крыўды. Пасля гэтага вырашалі ўсе свае канфлікты, раіліся як быць, публічна мірыліся, каб не несці цяжар крыўды ў Новы год і дамаўляліся на наступны год альбо разыходзіліся кожны сваім шляхам. І зараз людзі стараюцца вырашыць старыя канфлікты і набліжэнне Новага году – лепшы час, каб пакінуць спрэчкі ў мінулым. На працягу калядных тыдняў сярод больш старэйшага пакалення было звычайна хадзіць у госці да родных і сяброў. Частавалі гасцей звычайна каўбасамі, стравамі з мяса, птушкі, рыбы, гарэлкай.У апошні вечар Каляд, на трэцюю куццю, праводзіўся абрад “запісвання” Каляд. Гаспадар крэйдай маляваў крыжы на усіх дзвярах, каб нячыстая сіла, што ўцякла пад час вясёлага свята, не змагла прабрацца ў хату ці хлеў. Так заканчвалася самае вясёлае і самае любімае нашымі продкамі свята. Пазней, з прыходам хрысціянсва, Каляды падпарадквалі пад рэлігійнае свята Раства Хрыстова, і паколькі поўнасцю знішчыць любімыя народам вяселыя традыцыі не ўдалося, яны былі крыху зменены на царкоўны лад. Так, калядныя песні і невялікія тэатральныя пастаноўкі пачыналіся царкоўнымі гімнамі ды біблейскімі эпізодамі, нованароджанае Кола змяніў Езус. Але магічны сэнс свята, багаты стол, падарункі, паходы ў госці адзін да аднаго, маскарад, містычны дух нараджэння новага, таямніцы ды казкі так і засталіся з намі па сённяшні дзень.

# Сцэнарый народнага свята
# “Калядкі”

**Галоўныя дзеючыя асобы і выканаўцы:**
Гаспадар і гаспадыня;
Павадыр калядоўшчыкаў;
Каза;
Механоша;
Калядоўшчыкі;
Лявоніха;
Дзед, баба;
Мальвіна;
Несцерка;
Пацешкі.

**1 пацешка**
Запрашаем на Калядкі,
даражэнькія сябры!
Пашукайце, калі ласка,
Беларускія бліны.
**2 пацешка**
Вас гасціннасцю вітаем,
Запрашаем, запрашаем,
Паважаныя сябры!
На калядкі ўсе сюды!
**3 пацешка**
Казу добра сустракай –
будзе добры ўраджай!
**1 пацешка**
Вясёлыя калядкі – да нашай хаткі!
**2 пацешка**
Песні, танцы харашы – весяліся ад душы.
**3 пацешка**
Дзе каза ходзіць – там жыта родзіць.
**1 пацешка**
У гульнях вы ўдзел прымайце, ды ў плясках не зявайце.

(Гучаць народная мелодыя або песня, На кірмашнай плошчы з’яўляюцца Гаспадар, Гаспадыня, Мальвіна (з к. “Несцерка”)

**Пацешкі** (усе):

Калядны кірмаш! Калядны кірмаш! Усіх кліча вас!

**Гаспадар**

Запрашаем да сябе!

**Гаспадыня**

Заходзьце, не пашкадуеце, калі час маеце.

**Гаспадар**

Будзьце, як дома, не саромейцеся! На кірмашы нашым пагуляйце.

**Гаспадыня**

Міласці просім, дарагія госцікі! Чакае кірмаш вас, гаворым без прыкрас, будзе весела ў нас.

**1 пацешка**

Хоць я сам не прыгож, а тавар прывёз харошы,
тары-бары, расшабары, ёсць і тут добрыя тавары,
прадаў – пражыў, купіў – нажыў.

**2 пацешка**

І прыпеўкі ёсць вясёлыя ў нас!
І цудоўны беларускі перапляс!
Тры арцелі спевакоў, ды паўсотні плясуноў.

**3 пацешка**

Для кожнага роту знойдзеш работу.
Каму масла, каму сыр, хто заплаціць, таму пір!

( На пляцоўцы з’яўляецца Несцерка, баба і дзед. Дзед нясе ў чугуне калядную куццю. Гаспадар і гаспадыня сустракаюць гасцей).

**Гаспадыня**

Міласці просім, дарагія госцікі, на наш кірмаш.

**Гаспадар**

А ў гасцей жа твары адкрытыя, вочы бліскучыя, усмешкі на твары, а гэта значыць: не заляжацца сёння ў нас тавары!

**Несцерка**

Ну што за тавар: і той харош, і гэты харош! Выбірай, які хош!

**Мальвіна**

Калі ласка, даражэнькія, сюды зірніце. Міскі, талеркі, гаршкі ўласнага вырабу. Дальбог, дабрыня! Дальбог, прыгожыя! Кожнаму да спатрэбы, кожнаму да спадобы! А як добра ў маіх гаршках куццю калядную варыць, бліны на стол падаваць.

**Несцерка** (спыняецца каля Мальвіны)

Але ж і кірмаш!.. Людзей, як вады, не раўнуючы. Цякуць, нібы ручайкі ў мора! Круцяцца, нібы віхор носіць!

**1 пацешка**

Пакаштуйце, панок, мой салодкі мядок!

**2 пацешка**

Квасіку кілішак, для здароўя кішак!

**3 пацешка**

Чаго жадаеце? Я маю ўсё, што трэба.

**1 пацешка**

Ідзі направа,
Улева павярні,
Там цябе чакаюць
Смачныя бліны.

**2 пацешка**

А калі захочаш піць –
у гэты церам паспяшы.
Там прыгожая дзявіца
Дасць табе кваску напіцца.

**3 пацешка**

Падыходзь да самавару,
Выпі чаю з пылу, з жару,
З'еш гарачы піражок
Не саромейся, дружок.

**Несцерка**

Я то й праўда, чаго тут толькі няма? (Агледзеўся) А вось мыла, мабыць, і няма… А я купіў бы… Але як кажуць: купіў бы сяло, толькі грошай вось гало.

**Мальвіна**

А я чула, што ты мастак байкі расказваць, дык вось за добрую байку дам я табе і мыла.

**Несцерка**

Чаго не зробіш, каб збылося жаданне. Так і быць, слухайце. Вось, значыць, адбылася аднаго разу са мною такая бяда. Іду гэта я на хутар да шляхты, каб зарабіць крыху, а дарога вядзе праз балота. Тут бачу я: конь нечы ў балоце топіцца, а гаспадар каля яго бегае, лямантуе, бядуе, на дапамогу кліча, а навокал няма нікога, апроч мяне. Ну, я адразу кінуўся, ухапіў каня за хвост, ды цягну. Гаспадар таксама цягне. Выцягнулі мы жывёліну. Каб не я, загінуў бы конь. Ат на тую бяду хвост у каня адарваўся. Дык гаспадар замест таго, каб падзякаваць, на мяне ж і накінуўся: "Ты, кажа, у маёй кабылы хвост адарваў, дык і плаці за гэта, а калі не – да суддзі". Схапіў мяне за каўнер і не пускае. Тады я вырваўся і

пабег. Бягу, а ён за мной. Я на мост, і ён на мост, ледзь не злавіў, але ж сігануў у ваду, а пад мастом на гэтую бяду кабета нейкая бялізну мыла. Дык я на яе незнарок ускочыў і разам з ёю ў ваду зваліўся. Вылез я з вады. Баба таксама вылезла. Крыку было… Доўга гналіся за мной, амаль да самага мястэчка. Ледзь уцёк ад іх. Калі б злавілі, то ў кутузку пацягнулі б. Але трасцу яны зловяць, не такі Несцерка чалавек, каб жыўцом ды ў рукі давацца,

**Мальвіна**

Дзякуй, табе, Несцерка, павесяліў нас! Заслугоўваеш ты мыла, бяры яго (аддае яму кавалачак мыла) (Гучыць мелодыя "Лявоніхі". Выходзіць Лявоніха. Танцуе).

**1 пацешка**

А вось і наша цётка Лявоніха, майстрыха кросны ткаць і ходнікі.

**2 пацешка**

У яе столькі ручнікоў – усе на лёне, воўне.

**3 пацешка**

Глянеш, як на ніве, зялёна, чароўна!

**Лявоніха**

Добры тавар сам сябе хваліць.
Якая кудзеля, такая і прадзеля. Але ж
у нас кажуць: "Прадаць лягчэй, купіць цяжэй".
Я не з пустымі рукамі прыйшла на свята. Бачыце,
якія ў мяне цудоўныя беларускія сувеніры. Хто
жадае купіць мой тавар, няхай паспрабуе назваць
мне калядныя беларускія прыкметы.
(Калі не знаходзіцца смелых, Лявоніха сама дапамагае)

1. Як на Каляды неба яснае, то ўраджай будзе на ўсё;
2. Як іней вялікі на Каляды – будуць раіцца пчолы;
3. Чым даўжэйшае сена, тым лепшы ўраджай будзе;
4. Калі снег ідзе на Каляды – будуць раіцца пчолы;
5. Многа зорак на небе – летам будзе шмат грыбоў.

**1 пацешка**

Гэй, добрыя людзі! Паглядзіце, што будзе –

**2 пацешка**

Дзед з бабаю гуляюць, да сябе запрашаюць!

**3 пацешка**

На забаву спяшайцеся, ды не вельмі штурхайцеся! Гэй, добрыя людзі, паглядзіце, што будзе!

**Баба**

А якое ж нам, дзеду, гулянне?

**Дзед**

Ды што ты, баба, мы ж з табой таксама былі маладыя і гулялі, і кахаліся, і, нават, цалаваліся. Ці ты ўжо забыла, як да мяне праз акно бегала, нібы тая козачка? (Баба саромееццa, махае рукамі).

**1 пацешка**

Слухай, сябра, а ты не ведаеш, навошта гэта на Каляды сена на стол пад абрус кладуць?

**Баба**

(пачула пытанне і падыходзіць бліжэй) Я то ведаю, а ці ведаюць нашы госці навошта сена (адказы) Так, так. А як жа інакш? Без сена каляду сустракаць нельга. Ці праўда то, ці не, але людзі здаўна гавораць: чым даўжэйшая пугава, тым лепшы ўраджай будзе. Здаўна так рабілі і дзяды, і прадзеды, і бацькі нашы.

**1 пацешка** (да Дзеда)

Дзед, а чаго ты тут з чугуном носішся, як з пісанай торбай?

**Баба**

Дык гэта ж мы на свята калядную куццю прынеслі, яна ж азначае багацце і дабрабыт на працягу ўсяго года.

**Дзед**

А вы, госцейкі, чуйце, ды й куццю нашу спрабуйце.

**Баб** Частуйцеся, даражэнькія, калі ласка. (частуюць усіх)

**3 пацешка**

Дзякуй, баба, за куццю, ат каб чым горла прамачыць!

**Гаспадыня**

Паспрабуйце мой квасок! (частуе ўсіх)

**2 пацешка**

Вось квасок, дык квас, валіць з ног ураз.

**Гаспадыня**

А як жа? Мой квас асабліва прыгатаваны. Паспрабуеш майго квасу, ногі просяцца да плясу.

**Гаспадар**

Гэй, музыкі, грайце, а вы, пацешкі, у карагод запрашайце! (Усе танцуюць) (Пасля танца гучыць калядная песня)

**Гаспадыня**

Каладоўшчыкі ідуць, свае песні нясуць, і казу з сабой вядуць. (Калядоўшчыкі шумна падымаюцца на сцэну)

**Павадыр**

А ці дома сам пан Гаспадар! Добры вечар! Шчодры вечар!

**1 калядоўшчык**

Ой, нам казалі, што няма дома…

**Гаспадар**

Дома, дома, праходзьце, калі ласка! Добраму госцю заўсёды рады.

**Механоша**

Ой, та, пан харошы, рыхтуй пятак і грошы.

**2 пацешка**

Наверх сала і таго мала!

**Усе**

Гэй, каляда.

**Лявоніха**

З калядой здружыцца – пець і весяліцца.

**Павадыр**

Казу вядзем, людзям радасць нясем! Гэй, каляда! Добры вечар! Шчодры вечар!

**Механоша**

Калядкі, Калядкі,
Везлі бліны і аладкі.
У маляваным вазочку.

**Усе**

Шчодры вечар! Багаты вечар!

1 калядоўшчык: Го-го-го, Каза, го-го-го – шэрая, дзе рогі дзела?

**Каза**

На соль іграла. Соль дарагая, мера скупая.

**Павадыр**

Не дыбай, каза,
Крывыя ногі,
Не станавіся
Папярок дарогі…
То будзе пан ехаць, казу прыб’е,
А повар зрадзіць раду худую, раду худую.
Козачку зжыць, у супе зварыць,
А з скуры - халявы пашыць.
(Каза палохаецца і падае)

**2 калядоўшчык**

Трэба казе дагаджаць. Бо дзе каза ходзіць, там жыта родзіць.

**Механоша**

Дзе прабягае, там вышэй сягае. Дзе каза рагамі, там жыта снапамі.

**1 калядоўшчык**

Дзе каза хвастом, там жыта кустом.

**Павадыр**
 Дзе каза нагою, там жыта капою.
**Механоша**
Да ты, гаспадынька, не будзь такою
Як тая была барабаніха.
Ідзі, гаспадынька ў клетачку, у клетачку,
Ды зазірні ў бачок,
Дзе стаіць мачок.
Залезь на баляску
Ды дастань каўбаску.
**Павадыр**
Палажы казе на рожанькі
Два піражанькі,
А на хвасток – сала кусочак.
**Механоша**
Дай, гаспадынька, казе сала,
Каб каза ўстала ды й паскакала.
(Гаспадыня дае прыпасы Механошу, Каза назірае за імі).
**Гаспадыня**
Хоць наша хата і не вельмі багата,
Але ж тое-сёе ёсць, вось і мядок, і сырок,
І каўбаса, і піражок. Частуйцеся! (частуюцца ўсе)
**Механоша**
Гаспадынька, перапёлачка,
У цябе ж жырочку поўна полачка,
А мы цябе віншаваць будзем,
І з дзеткамі, і з сямейкамі,
І яшчэ з добрым здароўечкам!
Каб ты лета дачакалася,
Калядоўнічкаў зноў сустракала,
Падарункамі надзяляла.
**Павадыр**
Трэба, трэба Казе дагаджаць
Ды прысмакі розныя даваць,
Няхай ідзе ў круг гуляць,
Будзем зараз танцы танцаваць!
(Полька-весялуха. З’яўляецца чорт)
**Механоша**
Дарагія госцейкі! Жадаем вам у клеці карабамі,

а ў печы пірагамі,
каб здаровенькі былі
многа год жылі!

**Чорт**

Каб нічога не было
Каб і жыта не расло,
Каб людзей не частавалі,
Каб і гумны пуставалі.
(Чорта ганяюць, б'юць)

**Механоша**

Каб шасткі ламаліся ад каўбас,
А бліны-аладкі самі выскоквалі з патэльні.

**Чорт**

Каб бліны не адставалі,
Да патэльні прыгаралі.
(ганяюць чорта)

**Павадыр**

Каб былі поўныя кублы яец,
А ў вашых хлявах – шмат свіней і авец!

**Чорт**

Каб вашы куры не несліся, ды квакталі,
А свінні не вяліся, ды здыхалі!
(Чорта ловяць, завязваюць яму рот)

**Механоша**

Жадаю мірнага неба, духмянага хлеба,
Ключавой вады, ніякай бяды.
(чорт вырываецца)

**Чорт**

Каб толькі па барадзе цякло, а ў рот не пападала!
(каза рагамі праганяе чорт і ўсім кланяецца)

**Гаспадар**

Дзе вы гэту казу ўзялі?

**Павадыр**

На кірмашы ў аднаго гаспадара купілі.

**Гаспадыня**

А дзе ж сам так вывучыўся?

**Павадыр**

Па ўсім свеце ходзячы,
Торбу хлеба носячы,

Між людзей бываючы,
Дзіва-дзіўнае відаючы,
Розныя кнігі чытаючы,
Уверх нагамі трымаючы.

**Механоша**

Вялікі дзякуй вам, Гаспадар з Гаспадыняй, за добрую сустрэчу ды за смачны гасцінец.

**1 калядоўшчык**

Гаспадарам жадаем на полі каноплі.

**2 калядоўшчык**

На таку – умалотаў.

**Павадыр**

У млыне з прытоламі.

**Механоша**

У дзяжы з падходам, у пячы з падростам.

**Усе разам**

На стале з прыбыткімі, з дробнымі ўжыткамі. (гучыць песня калядоўшчыкаў)

**Мядзведнік**

Ну-ка, Мішанька, паскачы харашэнька.
(мядзведзь спрабуе танцаваць)
Гэта табе не пчолак драць,
Слухай нашага брата мядзведзіка,
Хто цябе корміць, поіць,
Ад ліхіх сабак абараняе,
Шлях-дарогу паказвае.
Ну-ка Мішанька, прасі ў гаспадара каляднага пачастунку.
Адным вочкам плач,
А другім дару прасі.

**Мядзведзь**

Дайце каўбаску, дамоў панясу!

**Усе**

Добры вечар! Шчодры вечар!

**Мядзведзь**

Дайце крывянку, укіну ў ямку!

**Усе:** Добры вечар! Шчодры вечар!

**Мядзведзь**

Грудачку кашкі, кончык каўбаскі.

**Усе**

Добры вечар! Шчодры вечар!

(Мядзведзь кланяецца гаспадыні).

**Гаспадыня**

Абавязкова і цябе пачастуем, мядзведзь, але ж да цябе былі калядоўшчыкі, дык яны і спявалі, і танцавалі, а ты не паспеў парог пераступіць, а адразу “Давай сала, каўбасу”. Дапамажы мне танец станцаваць, а то ногі мерзнуць.

**Гаспадар**

Грай, музыка, далібог, не шкадуй ты нашых ног! Яны хочуць танцаваць (танцуюць)

(Гаспадыня частуе калядоўшчыкаў. Калядоўшчыкі адыходзяць)

**Гаспадыня**

А зараз я загадаю вам загадкі, а самых кемлівых узнагароджу.

**Гаспадар**

Усе бачылі, якая спрытная мая гаспадыня. І спявае і танцуе, і з гаспадаркай добра спраўляецца. А якія гаспадынькі сядзяць тут у зале. Прапаную вам гульню “Падчапі гаршчок” (на пляцоўку - ўсе ўдзельнікі)

**Гаспадыня**

Жыць пажываць, ды дабра нажываць, каб былі здаровы, як дубы скарбовы.

**Несцерка**

Каб вы цэлы век весяліліся,

Каб доўгія гады жылі, каб здаровыя былі.

(гучыць народная песня)

# “Ідзе каляда калядуючы..."

## Сцэнарый тэатралізаванага прадстаўлення

**Дзейныя асобы:** Вядучы, калядоўшчыкі, Гаспадар, Гаспадыня, Каза, Мядзведзь.

**Вядучы**

Добры дзень, дарагія сябры! Вось і надышлі зімовыя святкі-калядкі. Здаўна нашы продкі ўмелі сустракаць і праводзіць святы. Давайце і мы далучымся да калядоўшчыкаў і паглядзім, з чым яны да нас завіталі.

*Гучыць песня "Ой, калядачкі, бліны-ладачкі”.*

**1-ы калядоўшчык**

Ой, калядачкі-калядкі!
Дружна плешчам мы ў ладкі.
З песняй па сялу ідзём,
Зорку-сонейка нясём.

**2-і калядоўшчык**

А зорачка наша іскрыстая
На жытцо каласістае,
На зернейка залатое,
На дабро маладое.

**3-і калядоўшчык**

На вясенку красную,
На зараньку ясную,.
На вадзіцу талую,
На пашаньку ўдалую.

**4-ы калядоўшчык**

На даўжэйшы дзянёк,
На дружны ручаёк,
На цёплыя лецечкі,
На пахкія кветачкі.

**5-ы калядоўшчык**

А мы - вяскоўцы знатныя,
Да песень-танцаў здатныя.
Ды і ўсякая праца ў нас спорыцца,
Ніхто за намі не ўгоніцца.

**6-ы калядоўшчык**

І жняцы мы, і касцы,
Ва ўсіх справах малайцы.
Ёсць запасы ў нашых амбарчыках,

А ў хлявах - акурат па кабанчыку.
**1-ы калядоўшчык**
На падвор'ях гусі, куры з петухом,
Пчолкі ёсць і соты, поўныя з мядком,
Пачастуюць госця, толькі еш,
Што пасля аж песню запяеш.
**2-і калядоўшчык**
Як ідзём мы - люба паглядзець!
Ходзіць з нашай калядой мядзведзь.
І казу вядзём з сабой якраз,
Вось і хатка, дзе чакаюць нас.
*Калядоўшчыкі заходзяць у хату.*
**3-і калядоўшчык**
Добры вечар у добрую хату!
А ці рады вы нам, ці не рады?
**Гаспадыня**
Рады, рады. Даўно вас чакалі,
Тры разы ў акно выглядалі.
**Гаспадар**
Заходзьце, просім у святліцу,
Нясі, гаспадыня, гасцінцы.
*Гаспадыня ставіць на стол розныя стравы.*
**Гаспадыня**
Вось блінцы аўсяныя,.
На яйках замяшаныя,
Капуста, бульбачка і квас!..
Прашу бліжэй сабрацца вас.
*Калядоўшчыкі падыходзяць да стала. Каза круціць галавой, валіцца на падлогу.*
**4-ы калядоўшчык**
Ах, наша козачка пакацілася,
На бачок павалілася.
Заплюшчыла вочкі, не есць і не п'е.
Не тыя прысмакі гаспадыня дае.
**Гаспадыня**
Ой, што ж я зрабіла не так?
І які трэба козачцы прысмак?

**5-ы калядоўшчык**

Калі можна, гаспадарочкі, з вашае ласкі -
Наша козачка надта любіць каўбаскі.
**Гаспадар**
Во, а мы пра каўбаску забылі,
Ледзь бедную скацінку не ўквялілі.
Уставай, козачка, уставай,
Вось каўбас шасток - выбірай.
*Каза і калядоўшчыкі падыходзяць і выбіраюць каўбасы.*
**6-ы калядоўшчык**
Возьмем адну, кругленькую, як сонца,
Каб у вас быў дастатак бясконцы.
**1-ы калядоўшчык**
Каб не было хвароб і бед,
Возьмем яшчэ адну на абед.
**2-і калядоўшчык**
Каб не было ніколі сваркі,
Мы не пагрэбуем і скваркай.
**3-і калядоўшчык**
А наш Мішка-мядзведзь любіць карагоду.
Можа, дасцё, ягамосці, крышачку мёду.
Наш Мішка заўсёды спрытны і лёгкі,
Калі хто дасць мёду - адразу ў скокі.
**Гаспадар**
Уважым, уважым вашага Мішку.
А ці ёсць пад мёд у вас міска?
**4-ы калядоўшчык**
Дзядзечка! Ёсць і жбанок, і начоўкі,
Калі не паднімем, возьмем сані з вяроўкай.
*Гаспадар выносіць гладышак мёду. Мядзведзь спрабуе, кланяецца гаспадарам. Гучыць музыка, усе танцуюць.*
**5-ы калядоўшчык**
Каб жыта расло ў вас і колас быў дужы,
А ў садзе каб спелі вішні і грушы.
Каб бульба радзіла, і морква, і рэпа,
А ў хаце быў хлеб, а яшчэ і да хлеба.

**6-ы калядоўшчык**
Жадаем, каб вашая хата
Была заўсёды багата

Скацінкай, аўчынкай,
Кудзеляй, пярынкай.
**1-ы калядоўшчык**
Тонкім кужальком,
Саламяным сенніком,
Тканымі дыванамі,
Ільнянымі ручнікамі.
**2-і калядоўшчык**
Падушкамі аж пад столь,
Толькі каб не з’ела моль,
А яшчэ маслам і салам поўным цабэркам,
Фіранак, карункаў багатым куфэркам.
**3-і калядоўшчык**
І малачком, і кумпячком,
І цёплым хлебам з печы,
І камізэлькай на плечы.
**4-ы калядоўшчык**
Сыночкамі-дочкамі
І ўнучыкамі-званочкамі.
**5-ы калядоўшчык**
Здароўя вам моцнага на сто год,
Жыць доўга без турбот і нягод.
*Калядоўшчыкі кланяюцца гаспадарам, ідуць да дзвярэй.*
**Гаспадар**
Дзякуем, дарагія госці,
За добрыя пажаданні.
**1-ы калядоўшчык**
І мы вам удзячны, прабачэння просім.
А нам яшчэ хадзіць да рання.
**2-і калядоўшчык**
Сонечнага вам свята,
Каб ваша шчодрая хата
Часцей гасцей сустракала,
А сэрца ад шчасця спявала.

**3-і калядоўшчык**
А грошай вялікіх нікому не раю,
Бо ім не бывае ні меры, ні краю.
**4-ы калядоўшчык**

А ўсіх багаццяў яшчэ ніхто не пазбіраў па свеце,
Таму заставайцеся з дабрынёй і спагадай
І з мудрай вясковай парадай,
А мы з Калядою пайшлі да суседзяў.

*Усе калядоўшчыкі з музыкай, спевамі і танцамі выходзяць на вуліцу.*

## “Ой, Калядачкі, бліны ды аладачкі…”
## Сцэнарый каляднага свята

*Сцэна аформлена пад беларускую хату, упрыгожана вышыванымі ручнікамі. Гучыць песня «Калядачкі» ў выкананні ансамбля «Песняры».*

**Гаспадар**

Ой, жонка, нешта ў хаце нашай горача!

**Гаспадыня**

Дык, Лявоначка, я ж тры дні ў печы паліла, пякла, варыла, смажыла, хачу, каб калядоўнічкі зайшлі, нашай хаты не міналі. Сядай куццю спрабаваць.

*Гаспадары садзяцца за стол, перахрышчваюцца, першую лыжку куцці нясуць да акна.*

**Гаспадары**

Мароз, мароз, ідзі куццю есці! Што б ты не марозіў летам расады, агуркоў, гарбузоў, морквы і буракоў, і ўсяго таго, што Бог судзіць пасадзіць і пасеяць!

**Гаспадар**

Жонка, ці бачыш ты мяне?

**Гаспадыня**

Не бачу!

**Гаспада**

**.** Каб ты не бачыла за агуркамі, за гарбузамі, за капустай, за буракамі свету!

**Гаспадыня**

Ці бачыш ты мяне?

**Гаспадар**

Не, не бачу!

**Гаспадыня**

Каб жа ты не бачыў за стагамі, за вазамі, за снапамі свету!

*Дзеці ў час яды задаюць маці пытанні.*

**1-ае дзіця**

Вой, мамка, чаму ў нас сёння такі багаты стол?

**Маці**

Сёння абрадавая калядная вячэра — куцця. Сённяшняя куцця называецца шчодрай. А тыдзень назад, вы ж памятаеце, была поеная куцця.

**2-ое дзіця**

А з чым звязана гэта свята — Каляды?

**Бацька**

А гэта свята яшчэ дахрысціянскага паходжання. Абрадавыя магічныя дзеянні, якія выконваліся ў час Каляд, павінны былі спрыяць плёну ў працы

селяніна, засцерагаць яго сям'ю, гаспадарку ад нягод, няшчасцяў. А з прыняццем хрысціянства царква прымеркавала да Каляд царкоўнае свята — Ражство Хрыстова, якое адзначаецца сёмага студзеня.

**1-ае дзіця**

А чаму мы куццю паставілі на сена?

**Маці**

Бо Хрыстос на сене нарадзіўся.

**2-ое дзіця**

А чаму на Каляды казу водзяць?

**Бацька**

Бо здаўна на Беларусі казу лічылі сімвалам дабрабыту. Аднак у некаторых месцах водзяць жорава, мядзведзя. Ну, вось і пад'елі. А зараз паварожым, ці высокі лён будзе ўлетку. А ну, дзяўчаткі, выцягвайце з пад абруса па сцяблінцы сена (дзеці выконваюць просьбу бацькі). Во, добры будзе лён, добры. Ідзі, Марыля, паглядзі на неба, якое надвор'е.

*Марыля ідзе, праз некаторы час вяртаецца.*

**Марыля**

Вой, усё неба ў яркіх зорках. Будзе добры ўраджай збожжа і грыбоў у гэтым годзе. І снег пакуль не ідзе, чорныя сцежкі — будзем гэты год з чарніцамі, ды й грэчка ўродзіць.

**Бацька**

Дай Бог, дай Бог, каб усе нашы прыметы спраўдзіліся.

*У хату заходзяць дзяўчаты.*

**1-ая дзяўчына**

Калядкі — добрыя святкі, але мароз пракляты.

**2-ая дзяўчына**

Калядкі — добрыя святкі, бліны ды аладкі.

**3-яя дзяўчына**

На Каляды іней — ураджай на хлеб, неба ў зорках — ураджай на гарох будзе.

**1-ая дзяўчына**

На Каляды — кілбасы, на Вялікадня — сыр, а ўсё чалавек сыт.

**Усе разам**

Добры вечар, з Калядамі вас!

**Гаспадыня**

Праходзьце, праходзьце, дзяўчаткі.

*Дзяўчаты распранаюцца.*

**Адна з дзяўчат**

Ці не будуць цётка з дзядзькам супраць, калі мы сёння паварожым, за каго замуж пойдзем?

**Гаспадар**

Вой, замуж яны сабраліся, вы ж яшчэ малыя, у рэшаце спіце!

**Дзяўчаты**

Якія мы малыя, дзядзечка!

**Гаспадар**

Вой, бяды свет, гадайце, гадайце, я ж жартам. Цешцеся, пакуль маладыя.

*Дзяўчаты пачынаюць варажыць. Чуецца, як брэша сабака (загадваюць, хто ў які бок замуж пойдзе). Туфлямі перамерваюць хату. Дзве дзяўчыны (з іх адна гаспадыніна дачка) выходзяць па дровы, каб паваражыць. Тым часам астатнія змаўляюцца паставіць пад ложак місачку з вадой, трэсачкай, каб прысніўся суджаны. Пасля вяртаюцца дзяўчаты з дрывамі і таксама варожаць.*

**Адна з дзяўчат**

Сёння нанач, як вучыла мая бабуля, трэба ўмыцца, выцерціся новым ручніком і пакласці яго пад падушку. І прысніцца будучы муж, які будзе несці ў руках ручнік.

**Дзяўчаты** (дружна).

Пагадаем! Пагадаем! А цяпер трэба разыходзіцца, хутка калядоўшчыкі хадзіць будуць, на вуліцы чуваць ужо смех, песні, музыка, гоман. Бывайце здаровы!

*Дзяўчаты выходзяць з хаты і чуюць песню калядоўшчыкаў.*

Едуць, едуць Калядкі,
Вязуць бліны і аладкі
На сівенькім канёчку,
На маляваненькім вазочку.

*Калядоўшчыкі падыходзяць да дома і спяваюць.*




Ой, ішла Каляда, калядуючы, праз сяло,
Зайшла ж яна да пана Сцяпана пад вакно:
— Ой, пане Сцяпане, харошыя дочкі ў цябе,
А што ж твае харошыя дочкі рабілі?
— А што ж мае харошыя дочкі рабілі?
А ў стадоле ды ўсё пшанічаньку мералі,
Намералі трыццаць шанкоў і чатыры.
А тыя чатыры вам, каляднічкам, Каляда!

*Стук у дзверы.*

**Калядоўшчыкі**

Ці дома гаспадар?

**Гаспадар**

Дома, з печы каўбасу дастаю.

**Калядоўшчыкі**

Ці дома гаспадыня?

**Гаспадыня**

Дома, дома, сталы прыбіраю.

*Калядоўшчыкі ўваходзяць у хату, наперадзе — «павадыр» з «казой».*

**Калядоўшчыкі** (па чарзе).

— Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!
— Ці ты спіш, ці ты так ляжыш?
— Ці ты так ляжыш, ці лісты пішаш?
— Мы ж твайго двара не мінём!

**Гаспадары**

Дзякуем! Дзякуем!

**1-ы калядоўшчык**

З Калядамі велічаем!

**2-і калядоўшчык**

На тваім двары усе агні гараць.

**1-ы калядоўшчык**

Усе агні гараць, усе сталы стаяць.

**3-і калядоўшчык**

Усе сталы стаяць пазасціланыя.

**2-і калядоўшчык**

Усе хлябы ляжаць павыпяканыя.

*Калядоўшчыкі праходзяць па хаце і звяртаюцца да ўсіх з песняй.*




Добры вечар табе, пане гаспадару!
Радуйся, ой, радуйся, зямля, —
Сын Божый нарадзіўся!
*(пасля кожн. радка паўтор)*
Засцілайце сталы, усе, колькі маем,
Ды кладзіце калачы, святую пшаніцу.
Ды прыйшлі к нам жэ да тры святы ў госці:
А першае свята — Хрыстова нараджэнне,
А другое свята — святое Васілле,
А трэцяе свята — святое Вадохрышчэ.

**Усе калядоўшчыкі**

Добры вечар вам, ці рады вы нам?

**Гаспадары**

Мы-то рады. Ды хто ж вы такія?

**Калядоўшчыкі**

Мы людзі не простыя, з далёкага краю!

**Гаспадыня**

Куды ідзяце?

**1-ы калядоўшчык**

Ідзём мы да пана Года, што носіць бараду шыроку, як лапата, сіву ды калмату!

**2-і калядоўшчык**

Мы к лету ідзём, казу вядзём ды шчасце нясём!

**3-і калядоўшчык**

Ці шырокія сцены, каб нам пагасцяваць? Ці добрая гаспадыня, каб нас пачаставаць?

**Гаспадыня**

Гаспадыня то добрая, але за што вас частаваць? З чым вы прыйшлі, калядоўшчыкі?

**Калядоўшчыкі**

З казою шэраю, вясёлаю.

**Каза** (рассыпаючы жыта).

Святкуем Калядкі —
Лавіце зярняткі!
Лавіце рукой,
Каб добры быў настрой!
Каб моцна грэла сонца —
Кіну ў аконца.
Майце ўсяго даволі,
А бяды ніколі.
Нікога не хвалюйце,
А ўсім святло даруйце.

**Гаспадар**

Дык няхай яна паскача!

**Калядоўшчыкі**

А ну, каза, павярніся, гасцям добрым пакланіся!

*Гучыць песня «Го-го-го, каза». «Каза» скача, брыкаецца. валіцца на падлогу.*




Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе рожкі дзела?
На соль праела.
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Пакажы чапец.
Лезь, каза, на печ,
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Лезь, каза, на кут,
Пакажы хамут.
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
— Лезь, каза, на пол,
— Пакажы хахол.
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза рогам,
— Там жыта стогам.
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
Го-го-го, каза,

Го-го-го, шэра,
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.

**Калядоўшчыкі** (па чарзе).

— Каб каза устала, трэба даць ёй кусок сала!
— А на кожны ражок павесіць піражок!
— А вунь гаспадар ідзе, каўбасу нясе, тры кускі сала, каб каза устала, мерку аўса, каб каза пайшла, мерку жыта, каб каза была сыта!

*Гаспадар вешае на рогі сала, каўбасу, «каза» ўстае.*

**Калядоўшчыкі** (па чарзе).

— Мы хадзілі, гулялі, калядавалі, прыйшлі, прыгулялі да гаспадарова стала.
— Гаспадар наш, бацюшка! Пачастуй гасцей з клеці — рэшатам, з печы — пірагом.
— Падай каўбасу, у зубах панясу.

**Гаспадыня**

Дык за што вас частаваць, спачатку трэба пасляваць.

*Гучыць песня «А ў гаспадара пасярод двара».*




А у гаспадара пасярод двара, Каляда!
Стаіць вішанька зеляненькая, Каляда!
На тэй вішаньцы гарыць свечачка, Каляда!
З тае свечачкі упала іскарка, Каляда!
З тае іскаркі стала возера, Каляда!
А у там возеры сам Бог купаўся, Каляда!
Просім Божаньку на вячэраньку, Каляда!
На вячэраньку, на куцічаньку, Каляда!
Не столькі з'ясі, колькі нам дасі, Каляда!
Не столькі сап'еш, нам болей нальеш, Каляда!

**Дзеці** (падбягаюць да гаспадыні, цягнуць яе за руку, за фартух і кажуць па чарзе).

— Я ў цябе, цётухна, пакалядую!
— Я ў цябе, цётухна, каўбасу чую!

— Дай, цётка, каўбасу, бо я хату разнясу!
— Дай, цётка, пірог, я пайду за парог!
— Вазьмі нажа вострага, адрэж сала тоўстага!

**Гаспадыня**

Не, не дам! Малавата спявалі, мала скакалі!

**Музыка**

Можна і яшчэ паскакаць.

**Дзеці**

Ну-ка, рэзні, гарманіст, залатыя пальчыкі,
Каб у скок пусціліся дзевачкі і мальчыкі!

*Танец «Бульба-полька». Адны выконваюцъ танец, другія спяваюць.*




Гарні, гарні бульбу з печы
У торбачку ды на плечы,
У торбачку ды нясі,
— Скажаш дзякуй, як з’ясі.
Прыпеў:
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Скажаш дзякуй, як з’ясі.
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Трам-там, ці-рам, та-ра-ра-рам.

Бульбу пякуць, бульбу вараць,
Бульбу ядуць, бульбу хваляць,

З бульбы клёцкі, з бульбы каша
— Вось такая доля наша.
Прыпеў.

І да кожнае да стравы
Годна бульба да прыправы.
Пакаштуеш шмат разоў
Ды захочаш бульбы зноў.
Прыпеў.

**Гаспадар**

Вось дык танцоры, вось малайцы! Пасядзіце ў нас, пачастуйцеся! Усё ў нас ёсць — і квас, і каўбаскі!

*Калядоўшчыкі частуюцца, гаспадыня кладзе пачастунак у мех, з сабой. Стуку дзверы. З 'яўляецца «цыган» з «цыганкаю». «Цыган» вядзе «кабылу».*

**Цыган**

Добры вечар вам!

**Цыганка**

Дай нам, добры чалавек, капу яек на паўміскі, белым сырам намазаўшы, каўбасою абкруціўшы!

**Гаспадар**

А чым вы нас парадуеце?

**Цыган**

Я — цыган багаты! У мяне ў кармане — вош на аркане! А ў другім — блыха на цапе!

**Цыганка**

Цыц, чорт стары! Пайду людзям добрым шчасця нагадаю.

*Ідзе да гасцей, гадае.*

**Цыган**

Купі, гаспадар, у мяне кабылу, другой такой не знойдзеш. Прадаю дарма, усяго за тысячу!

**Гаспадар**

За такую кабылу і грошык шкада аддаваць!

**Цыган**

Многа ты разумееш! Вось глядзі, якая яна ў мяне ласкавая. *(Гладзіць «кабылу», яна брыкае.)* Паглядзі, якая ў яе паходка. Плыве, як ў моры лодка! *(Цягне «кабылу», але яна стаіць як укапаная. Штурхае яе ў зад, «кабыла»хістаецца.)* Паглядзі! Мая сівая як бяжыць, дык зямля дрыжыць. *(Дае «кабыле» пад зад, яна падае.)* А няхай жа цябе ліха, гаспадар! Загубіў мне

кабылу! За гэтку чэсць давай карбаванцаў шэсць ды тры кускі сала, каб кабыла устала!

**Гаспадар** *(смяецца, выцірае слёзы).*

Убрыкні цябе камар! Бяры ўжо! *(Частуе яго.)* Пасядзіце ў нас, добрыя людзі!

*Госці частуюцца. Потым, пад 'еўшы і выпіўшы квасу, «цыган» з «цыганкаю» скачуць «цыганачку». Затым на сярэдзіну круга выходзіцъ «важак» з «мядзведзем».*

**Важак**

Кланяемся нізка ўсім, і Мішка кланяецца. («Мядзведзь» ківае галавой.) Ну-ка, Міша, пакажы, як бабы хлеб месяць. («Мядзведзь» паказвае.) Ну-ка, Міша, пакажы чэснай публіцы, як мужык Янка п'яны з кірмашу дамоў вяртаецца. («Мядзведзь» паказвае, перавальваючыся з нагі на нагу.) Так, так, Міхаіл, весялей. Весялей — мужык Янка добрых дзве кварты выпіў. І таму ног пад сабой не чуе. («Мядзведзь» паказвае, як ходзіць зусім п 'яны чалавек.) Пакажы, Міша, яшчэ, як дзеўкі на танцы збіраюцца («Мядзведзь» паказвае.) Ну, Міша, за старанне трымай мядовы пернік. Пернікі любіш? (Дае пернік «мядзведзю», той раскланьваецца.)

**Мужчына**

А ну барджэй, не баў гасцей:
Механошу — капу грошай,
Падхватнічкам — па цукерачцы,
Па цукерачцы, кілбасу на талерачцы.
Пачынальніку — чырвоны злоты,
Ад кошачкі — сала трошачкі,
Ад кароўкі — чвэрць галоўкі,
Ад коніка — бочка солі,
Ад авечкі — рэшата грэчкі,
Ад свінкі — шрот саланінкі.

**Калядоўшчыкі** (дзякуюць за пачастункі).

— Які гэты піражок — каб гэтакі каласок.
— Аз таго каласочка — жыта бочка!
— А за гэты кусок сала — каб свіння дзверы выстаўляла.

*Пакідаючы хату, усе спяваюць віншавальную песню «Паляцеў каршун, Каляда!».*




Паляцеў каршун, Каляда!
Каля тога саду, Каляда!

Курэй стаду, Каляда!
Нашоў жа ён, Каляда!

Стаў ён выбіраці, Каляда!
Катораю ўзяці, Каляда!

Што белыя скрылцы, Каляда!
Тая — лятушчая, Каляда!

Што жоўтыя ножкі, Каляда!
Тая — нясушчая, Каляда!

А што ў чубочку, Каляда!
Тая — каршуночку, Каляда!

# Сцэнарый свята "Калядкі"

Усе дзеці становяцца паўколам і спяваюць:

***(Гучыць песня «Добры вечар, госці»)***

1.Добры вечар, госці!
Просім вас мілосці.
Добры вячор, шчодры вячор.
2.Ой ды нашы хлопцы
Пайшлі шчадраваці.
Добры вячор, шчодры вячор.
3.Пайшлі шчадраваці
Ледзь іх даганяці.
Добры вячор, шчодры вячор.
4.Ой ды шчадравалі
У вокны заглядалі.
Добры вячор, шчодры вячор.
5.На новае лета
Радзі божа жыта.
Добры вячор, шчодры вячор.
Добры вячор, шчодры вячор.

**Шчодра**

Добры вечар, шчодры вечар,
Добрым людзям на ўвесь вечар!
Зараз Каляду сустракаць будзем
Гасцей частаваць будзем!

**Гаспадыня**

А хто гэта да нас стукае?

**Калядоўшчык:** Добры дзень, таму хто ў гэтым даму!

**Калядоўшчык:** Мы ад хаты да хаты ідзем, Каляду з сабою вядзем.

**Усе:*Каляда, калядзіца.***
***Добрая маладзіца.***

**Калядоўшчык**

Каб мелі вы грошы ды жылі ў раскошы.

**Калядоўшчык**

Каб у кожнай хаце было багацце.

**Усе**

***Каляда, калядзіца.***
***Добрая маладзіца.***

**Калядоўшчык1:**

Ехала Каляда ў чырвоным вазочку,
У чырвоным вазочку, на сівым канёчку!
**Калядоўшчык2:**
Добры вечар табе, пане гаспадару,
Радуйся, ой радуйся зямля,
сын божы нарадзіўся!
**Усе:*Каляда, калядзіца.***
***Добрая маладзіца.***
**Калядоўшчык:** Стары год канчаем Новы пачынаем.
**Калядоўшчык:** Хай будзе ён здароў. Нам прышле дароў.
**Калядоўшчык:** Каб усяго было даволі, а бяды ніколі.
**Усе:*Каляда, калядзіца.***
***Добрая маладзіца.***
**Механоша**
Ідзём талакою,
усіх віншуем з Калядою,
Сеем, веем, рассяваем,
з Калядою ўсіх вітаем!
**Звяздар**
Добры вечар таму,
хто ў гэтым даму!
Пусціце пашчадраваці,
ды вас павіншаваці!
Ці дазволіце каледаваць?
**Гаспадыня**
Праходзьце, госцейкі дарагія!
Міласці просім да нас у госці! (*Кланяецца*).
Дзякуй вам за вашы пажаданкі.
Адкуль вы?
**Калядоўшчык**
Мы хадзілі, гулялі, спявалі, калядавалі.
**Калядоўшчык**
Прыйшлі і ў вашу хату.
**Калядоўшчык**
Ці рады вы нам?
**Гаспадыня**
Рады, рады!
**Калядоушчык**
Гаспадыня добрая! гаспадыня шчодрая! Пачастуй нас!

**Гаспадыня**
Каб гасцінцы зарабіць,
Трэба нас павесяліць.
**Шчодра**
Мы спачатку пагуляем,
Вам загадкі загадаем.
**Загадкі**
Белы лёгкі і пушысты
Ён укрыў зямлю ўсю чыста.
Як прынёс яго я ў дом -
Ён разліўся ручаём.
*(снег)*
Ён нарадзіўся на страсе,
Вялікім вырас пакрысе.
На сонцы грэцца ледзь пачаў,
Заплакаў моўчкі і прапаў.
*(лядзяш)*
Белым пухам замяло
І палеткі, і сяло.
Мост праз рэчку хутка ляжа.
А што гэта, хто падкажа?
*(зіма)*
Аж два тыдні мы святкуем:
І варожым, і шчадруем.
Адкажыце, што за свята
Надышло цяпер? (Каляды)
Што за беленькая мушка
Апусцілася на вушка,
Ледзь чутно паказытала
І праз міг яе не стала?
*(сняжынка)*
Шыпіць патэльня на пліце.
Па хаце смачны пах ідзе.
Прыйшлі да нас Калядкі,
Гатуем мы... (аладкі)
Ён без фарбаў і алоўка
На акне малюе лоўка.
Лапкі елак, пальмаў веццэ.
Як жа той мастак завецца?

*(мароз)*
Дзе махне яна хвастом –
Жыта вырасце кустом.
Дзе ўпрэцца рогам –
Будзе жыта стогам.
Хто нам можа адказаць,
Як завуць яе? (Каза)
**Калядоўшчык**
Мы прыйшлі з казою шэраю -
Вельмі смелаю!
А ну, каза, скачы!
(Калядоушчыкі спяваюць песню, а каза скача)
1. Тупу – тупу – туп, Каза
Тупу – тупу, дзераза.
Тупу на Калядкі.
Тупу на аладкі. (2 р.)
2. Тупу – туп, Коза ногой
Тупу – туп, Коза другой.
Тупу на Калядкі.
Тупу на аладкі. (2 р.)
3. Тупу – тупу, слізкі лёд.
Тупу –тупу, Новы год.
Тупу на Калядкі.
Тупу на аладкі. (2 р.)
4. Тупу – тупу – туп, Коза.
Тупу – тупу, дзераза.
Ты, Козачка, не зявай,
А хутчэй нас даганяй!
(Каза даганяе дзяцей і падае на падлогу)
**Гаспадыня**
Ай, ай, памерла, Каза! А Божа ж мой!
**Калядоўшчык**
У мяне каза вучоная, любіць пачастункі, хоча падарункі.
**Калядоўшчык**
Гаспадыня, схадзі, каўбасу прынясі. Не устае?
**Усе**
Не ў стае.
**Калядоўшчык**
Тры кускі сала, каб каза ўстала! Не ўстае?

**Усе**
Не ўстае.
**Калядоўшчык**
Адну мерку аўса, каб каза пайшла. Не ўстае?
**Усе**
Не ўстае.
**Калядоўшчык**
Адну мерку жыта, каб каза была сыта.
**Каза**
А цяпер са мной усе ў карагод!
***(Каза устала. Гучыць «Го-го-го каза»)***
ГО-ГО-ГО, КАЗА
Го-го-го, каза,
го-го, шэрая!
Дзе рожкі дзела?
На соль праела.
Го-го-го, каза,
го-го, шэрая!
Дзе каза ходзіць,
там жыта родзіць.
Го-го-го, каза,
го-го, шэрая!
Дзе каза - рагом,
там жыта - стагом.
Го-го-го, каза,
го-го, шэрая!
Дзе каза - нагой,
там жыта – капой…
Го-го-го, каза,
го-го, шэрая!
Дзе каза - хвастом,
там жыта - кустом.
Дзе каза бывае -
Там шчасце вітае.
А дзе не бывае -
Там яно мінае.
**Шчодра**
Якая малайчына, якая разумніца ваша каза!
**Гаспадар**

Ну, каза, - закладай рогі
Ды падбірай ногі,
З хаты выхадзі -
Бяду вынасі.
**Гаспадыня**
Засядзеліся госці нашы.
Няхай цяпер для нас паскачуць.
*(Танец-гульня "Ішоў казёл па лесу")*
**Шел козел по лесу**
Шел козел по лесу, по лесу, по лесу.
Нашел себе принцессу, принцессу, принцессу.
***Припев***: Давай, коза, попрыгаем, попрыгаем, попрыгаем.
И ножками подрыгаем, подрыгаем, коза.
И ручками похлопаем, похлопаем, похлопаем.
И ножками потопаем, потопаем, коза.
И хвостиком помашем, помашем, помашем.
И просто так попляшем, попляшем коза.
Головкой покачаем, качаем, качаем.
И снова начинаем парам-па-па-пам-па.
Шел козел по мостику, по мостику, по мостику,
Нашел козу без хвостика, без хвостика козу.
***Припев***
Шел козел тропинкою, тропинкою, тропинкою.
Нашел козу с горбинкою, с горбинкою козу.
***Припев***
Шел козел канавою, канавою, канавою.
Нашел козу корявую, корявую козу.
**Гаспадыня**
А чым вы нас яшчэ парадуеце?
**Калядоўшчык**
Дай табе, гаспадынечка,
Каб у каморы і амбару
Было заўсёды, што даці.
**Шчодра**
А хто гэта да нас яшчэ завітаў?
(Уваходзяць цыгане з мядзведзем)
**Цыган1**
Я цыган багаты! У мяне ў адной кішэні - вош на аркане; а ў другой - блыха на цэпе. Здалёк іду - мядзведзя вяду. Ён танцуе, спявае і нават размаўляе.

**Цыган**

У нас мядзведзь калматы,
Злавіў яго дзед барадаты,
Зараз ён пацешыць нас,
Ён паслухмяны ў нас.
Пакажы, Мішка, як гаспадынька цеста месіць.

***(Гучыць беларускі народны танец «Мітусь»)***

А як дзяўчаткі перад люстеркам упрыгожваюцца?

***(Гучаць «Гарадскія наігрышы»).***

А як Вовачка скача, калі 10 атрымае?

***(Гучыць беларускі народны танец «Весялуха»)***

**Шчодра** Дзякуй вам усім! Паскакалі з вамі, маладосць успомнілі. А мы яшчэ ў маладосці на калядную ноч гаданні вялі.

**1 цыганка**

- А мы вам паварожым,
Шчасця-долі наварожым!

**2 цыганка**

Хто хоча ведаць, якія адзнакі ён будзе атрымліваць у наступным годзе? З мяха трэба выцягнуць саломіну. Калі яна доўгая то будуць дзясяткі, калі кароткая - то дзявяткі.

**3 цыганка**

Вынесь сала, не скупіся,
Каб твой ячмень урадзіўся!
Каб нажалі сто коп жыта,
Каб сям'я была ўся сыта!

**Цыганкі хорам**

Пазалаціце ручку, каб спраўдзілася!

*(атрымліваюць цукеркі – манеткі. Усе становяцца на развітанне)*

**Шчодра**

Ну, калі так, то мы зараз з вамі пагуляем у гульні. Можа пасля гульняў мы і расшчодрымся, і пачастуем вас і каўбаскай, і аладкамі!

Першая гульня называецца **"Кароль".**

**Гульня "Кароль"**

Кароль сядзіць на лавачцы. Дзеці тайна ад яго дамаўляюцца, што будуць рабіць (мясіць цеста, есці рыбу і г.д.). затым дзеці падыходзяць да караля: Добры дзень, дзядуля Кароль!

Добры дзень, дзеці! Дзе вы былі?

На панскім двары!

Што вы там рабілі?

Мы не скажам, а пакажам.

Пасля гэтага дзеці імітуюць рухі, пра якія дамаўляліся, а кароль услых угадвае. Як толькі адгадае, даганяе дзяцей. Той, каго кароль зловіць, становіцца новым каралём і гульня працягваецца.

**Гульня "Казёл"**

Удзельнікі гульні становяцца ў кола, беручыся за рукі, у цэнтры – "казёл" (чалавек, які, увасабляючы сябе ў гэтай ролі, прыстаўляе да галавы ўказальныя пальцы абедзьвюх рук). Удзельнікі водзяць карагод, спяваючы альбо прагаворваючы рэчытатывам наступныя словы: "Ішоў казёл, наш казёл, ды па ельнічку, усіх у госці запрашаў на вячэрачку". "Казёл" у гэты час гуляе ўнутры кола, але пры апошніх словах падыходзіць да каго-небудзь з удзельнікаў і кажа: "Запрашаю я цябе". Той, да каго звяртаецца "казёл", павінен адказаць: "Бе-е" і стаць за яго спіною. Тады ўдзельнікі лічаць: "Раз, два, тры". На лік "тры" "казёл" і яго абраннік падскокам абарочваюцца на 180 градусаў, і цяпер апошні становіцца "казлом", а былы "казёл" бярэцца за пояс новаспечанага і ўжо за ім ходзіць унутры кола пад спевы ўдзельнікаў. Новы ж "казёл" абірае сабе замену, і так да таго часу, пакуль лунцужок "козлікаў" здолее змяшчацца ўнутры кола.

**Гульня "Дудар"**

Дзеці ходзяць па крузе, узяўшыся за рукі і спяваюць песеньку. У цэнтры карагода варта "дудар". Праспяваўшы песню хорам пытаюцца ў "дудара": "Дудар, дудар, што баліць?". "Дудар" адказвае: "Галава" (спіна, бровы, вушы. і г. д.). І ўсе дзеці, якія знаходзяцца ў карагодзе, адначасова правымі рукамі бяруць, які стаіць побач суседа за названае "хворае месца". Песенька для "Дудара" спяваецца 2-3 разы і калі, у чарговы раз у "Дудара" пытаюцца: "Што баліць ?", ён адказвае: "Здаровы!". Выбірае з круга на сваё месца іншага і гульня працягваецца.

**Гульня "У мядзведзя ў бары"**

На пляцоўцы малююць дзве лініі на адлегласці 10 метраў адзін ад аднаго. За адной лініяй вадзячы - «мядзведзь», за другой - «дом», у якім жывуць дзеці. Дзеці выходзяць з «дома» ў «лес» збіраць грыбы і ягады. Яны падыходзяць да мядзведжай бярлогі са словамі:

«У мядзведзя ў бару
Грыбы, ягады бяру.
А мядзведзь не спіць,
І на нас глядзіць».

На апошніх словах «мядзведзь» выскоквае з «бярлогі» і стараецца злавіць дзяцей, якія ўцякаюць у свой дом.Злоўлены гулец сам становіцца «мядзведзем».

**Шчодра.**

А ці ведаеце вы, што напярэдадні Новага года існуе звычай красці. Таму кожнага, хто прыходзіў у хату вечарам, прымалі за злодзея! Хавалі рэчы. Крадуць нават скаціну. Але на другі дзень прыносяць і прыводзяць да гаспадара ўкрадзенае, і той павінен іх частаваць. Вось так, мае даражэнькія.

Не стаміліся? Хочаце яшчэ пагуляць? Калі хочаце. Давайце пагуляем. **Гульня называецца "Шкута"**. Станавіцеся, калі ласка, у паўкола. Вось бачыце, у мяне ў руках пятак, ды не медны, а залаты. Зараз я пайду паўз паўкола, ды гэты залаты каму-небудзь з вас аддам. Трэба выбраць таго, хто знойдзе гэты залаты.

(Ідзе выбар. Выбралі.)

Слухайце далей. Той, каго выбралі, павінен знайсці залаты, калі знойдзе, то становіцца на мае месца, а той, у каго ён быў, пільнуе. Трэба таксама казаць словы:

Шкута ідзе, золата нясе.
А хто адгадае,
Той вялікае шчасце мае.
(Пад музыку ідзе гульня "Шкута".)

**Калядоўшчык1:**

Час настаў нам паказаць,
Як умеем танцаваць.
*(танец “Маразуля”)*

**Калядоўшчыкі:**

- Мы са святам вас вітаем,
шчасця, радасці жадаем!
- Каб у вашай хаце
было заўсёды што даці!
- Каб былі міскі, лыжкі памыты,
і вашыя дзеткі сыты!
- Каб пілося-елася
і яшчэ хацелася!
- Будзьце здаровы,
як рыжык баровы!
- Майце торбу грошай,
жывіце ў раскошы!
- Збожжа поўнае клецце,
павагу ў свеце!
- Усяго даволі,
а бяды – ніколі!

**Шчодра**

Вялікі дзякуй вам за пажаданні! Вось вам за гэта па кварце добрага квасу, па кальцу кілбасу, бліноў ладных ды караваяў здатных.

**Калядоўшчык1**

Ну дзякуй гаспадарам за пачастунак
Каб у вашай хаце быў хлеб ды соль.
Каб была і скварка,
бульбы падполле, дзетак застолле.

**Калядоўшчык1**

Прыйшлі Калядкі – бліны і аладкі!

*(Песня "Ой, калядачкі, бліны-ладачкі")*

**<u>Калядачкі</u>**

Ой, калядачкі, бліны-ладачкі,
Ой, люлі-люлі, бліны-ладачкі. (2 р.)
Ой, калядачкі, вы хутчэй-хутчэй!
Ой, люлі-люлі, вы хутчэй-хутчэй! (2 р.)
Каляда, каляда, каляда, каляда!
Напячэм бліноў мы з дражжэй-дражжэй,
Ой, люлі-люлі, мы з дражжэй-дражжэй! (2 р.)
А калядныя бліны - ладныя,
Ой, люлі-люлі, бліны ладныя! (2 р.)
Мы калядачкам нарады будзем
Ой, на ігрычшы ды хадзіць будзем,
Ой, люлі-люлі, ды хадзіць будзем (2 р.)
Каляда, каляда, каляда, каляда!

**Калядоўшчык1**

На Новае лета
Хай родзіцца жыта...
Жыта, пшаніца,
Усякая пашніца!

**Калядоўшчык1**

Мы цябе, гаспадар, не зневажаем,
А з Новым годам паздараўляем,
Шчасця-долі жадаем!

**Шчодра**

Ну дзякуй вам, госцейкі дарагія, парадавалі, пацешылі нас.

**Гаспадыня**

Дзякуй вам, госцейкі добрыя,
За сустрэчу прыветную!
Каб доўгія гады жылі,

Каб здаровыя былі.
**Гаспадар**
Каб добра вучыліся,
А бацькі вамі ганарыліся.
Каб пілося вам і елася
І спяваць заўжды хацелася!
**Шчодра**
Запрашаем усіх за стол.
На свеце многа ёсць турбот
І спраў, мае сябры.
Хай прынясе вам Новы год
Найлепшыя дары.
Каб вы заўжды з малых гадоў
Шчаслівымі былі.
Расцілі шчырую любоў
Да роднае зямлі.
Ну, а зараз частуйцеся пірагамі!
***(Гучыць песня «Бывайце здаровы»)***
1.Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А мы ад, ад'язджаем
Да дому, да хаты
У зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем
Эх, вашае ласкі
Ва век не забудзем.
2.Няхай у вас будзе
Шчаслівая доля,
Каб мелі здароўе,
А гора – ніколі!
Каб песні гучалі
Заўжды ў вашай хаце
Каб людзі спявалі
І ў будні, й на святе!

# Грамніцы

Стрэчанне, зімовае свята народнага календара (каталікі адзначаюць яго 2 лютага, а праваслаўныя 15). Мяркуюць, што назва паходзіць ад язычніцкага бога Грамаўніка (Перуна) бога веснавых навальніц і дажджоў, якія спрыялі расліннасці. Паводле іншых меркаванняў, Грамніцы названы так таму, што Юрай нібыта выпрабоўвае на нячыстай сіле свае стрэлы і менавіта з гэтага дня ўжо можна пачуць грымоты. Другая назва свята Стрэчанне (ад царкоўнаславянскага «Сретенье») у хрысціянстве знаменавала сустрэчу Сімяона з Ісусам Хрыстом, сустрэчу Старога і Новага запаветаў, а ў народзе тлумачылася як сустрэча зімы з летам: «А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне, // Зіма з летам стрэлася, стрэлася. // Лета зіму піхнула, піхнула // І ножачку звіхнула, звіхнула. // Зіма пайшла плачучы, плачучы, // Лета пайшло скачучы, скачучы». Дзяцей, зацікаўленых пабачыць сустрэчу зімы і лета, пасылалі голых і босых за гум ны і гароды, абяцаючы, што зіма ім дасць чырвоныя боты. Пра гэты пера ломны дзень казалі: «На Грамніцы паўзіміцы». Па стане надвор'я прадказвалі характар надыходзячых вясны і лета. Якая пагода на Грамніцы, такая і вясна. Калі на Грамніцы вялікі мароз, то лічылася, што снег паляжыць нядоўга, а лета будзе пагоднае і сухое; мяцеліца на Грамніцы прадказвала доўгую вясну, а значыць недахоп корму для жывёлы; пацяпленне на Грамніцы сведчыла пра раннюю вясну («Калі на Г. певень напецца вадзіцы, то на Юря вол падесць травіцы»), аднак лета чакалася непагоднае, з невялікім ураджаем («На Грамніцы адліга з ураджаю будзе хвіга»). Асноўным рытуалам на Грамніцы было асвячэнне ў храмах свечак. На свята маці пяклі з цеста дочкам сярпы, а сынам косы. Пасля Грамніц сяляне пачыналі рыхтавацца да веснавых работ, мужчыны ладзілі сохі і бароны, жанчыны садзіліся за кросны.

# Грамніцы ( па матывах  каляндарнага свята)

**Дзеючыя асобы:**

Грамаўнік
Грамаўніца
Дзяўчаты
Хлопцы
Андрэй з калодай
Пані
Паніч
Вазніца
Павадыр мядзведзя
Мядзведзь
Гарэлыш
Пужайла і Пужаніца – “нячысцікі”

**Хлопец.** Добры дзень!

**Дзяўчына.** Дзень добры!

**Хлопец.** Сёння мы вам раскажым..

**Дзяўчына.** Раскажым вам мы сёння...

**Хлопец.** Пра тое, як вясна з зімою сустракаецца...

**Дяўчына.** Пра тое, як зіма з вясною стракаецца..

**Хлапец.** І свята гэтае нашы продкі называлі Грамаўнік!

**Дзяўчына.** Называлі продкі нашы гэтае свята Грамаўніца!

**Хлапец.** Грамаўнік!

**Дзяўчына**. Грамаўніца!(*Некалькі разоў паўтараюць, спрачаючыся)*

*З’яўляецца хлопец у фраку*

**Хлопец.** Стрэчанне!

**Дзяўчына і хлопец.** *(Разам)*Стрэчанне?

**Хлопец.** Так адбылася, што на Беларусі свята гэтае мае некалькі назваў. Грамаўнік, Грамніца, Стрэчанне - гэта ўсё адно свята.

**Дзяўчына.** То трэба скончыць спрачацца..

**Хлапец:** Спрачацца скончыць трэба..

**Дзяўчына.** Свята трэба пачаць..

**Хлопец.** Пачаць трэба свята…Паважанае спадарства, час запаліць грамнічныя свечкі .

*Кампазіцыя - эцюд «запальванне грамнічных свечак»*

**Дзяўчаты і хлопцы.***( Кажуць па чарзе)*

-Ой, выйдзем, дзевачкі, на новае лета, зімавалі - не спявалі, вясну чакалі.

- Грамніца- зімы палавіца.

- Грамніцы- хлеба палавіца, а зімы трэцяя частка.

- Прыйдзі, прыйдзі , вясна, прыйдзі, прыйдзі, красна, да нас у таночак, прынясі нам збожжа, прынясі нам красак, каб нам звіць вяночак.

*З'яўляюцца Пужайла і Пужаніца, «нячысцікі» у страшных масках, пужаюць іказычуць усіх, гасяць агонь на свечках* (*музычная кампазіцыя «злыя духі»)*

**Пужайла.** Го-го-го.. мароз!

**Пужаніца.** Гоо-го-го..завіруха!

**Пужайла.** Пойдзем мы ў згодзе ўдваіх скакаці. Людзям перашкодзім мы вясну гукаці.

**Пужаніца.** Каб хучэй мароз з'явіўся ды завіруха разгулялася, ды ўсіх бы разагналі, каб і з сваіх хацін не высунулі носа.

**Пужайла.** Вось калі б нам раздолле было, а то, бач ты, цяпла ім захацелася, --вясны чакаюць..!

**Дзяўчына.** Што рабіць?

**Хлопец** Трэба дапамогі прасіць.

**Павадыр мядзведзя.**

- Мядзьведзь, мядзведзь, разгонь тучу, дам табе аўса кучу.

Мядзведзь рыкае на «нячыстую сілу», яна хаваецца.

**Павадыр мядзведзя.**

Добры мішка, прасі за сваю службу, чаго жадаешь?

**Мядзведзь.**

Сонейка, сонца, выгляні ў акенца,

Пасвяці нам трошку, дам табе гарошку.

**Хлопец.**

Соўнейка- ядрушка, выблесні, выгляні!

Твае дзеткі на паветке сыр калупаюць -

Людзям раздаваюць.

Людзям па ложцы, а нам ні па крошцы.

**Дзяўчына.**

Сонца, сонца, выблесні ў аконца!

Я тваю матку відзела: на камушку сядзела,

Іголачкі істрыла, мяшэчкі мыла, намётачкі бяліла!

***У**се выконваюць песню «Свяці, свяці сонейка..»*

*«Нячыстая сіла» выцягвае драўляную калоду, моцна стукае па ёй, пужаючы ўсіх.*

**Дзяўчына.**

Каціласся калода, каля панава гарода,

Пыталіся ў Бога, што заўтра дождж ці пагода?

Пагода, пагода гу-у-у..

**Хлапец.**

Гнілая калода, ці будзе заўтра пагода?

Калі будзе - адгукніся, а не будзе- заікніся.

(Б*'е па калодзе і чакае, які будзе адказ)*

**Дзяўчына.**

Андрэйка - калода, што заўтра будзе ,

Дождж ці пагода?

Б-з-з.

**Андрэй.**

Калода, калода, ці будзе заўтра пагода?

Як цяпер то пушчу, а заўтра, то заб'ю.

**Усе.**

Калода, калода, калі будзе пагода?

Як цяпер, то ляці, як у чацверг, то сядзі!

*Дзяўчаты і хлопцы разганяюць«нячыстую сілу».*

*Музычная кампазіцыя «запальванне грамнічных свечак»*

**Дзяўчына.** Святое стрэчанне свечы сукае, лета сустракае.

**Хлопец.** Каб запліць грамнічныя свечкі трэба здабыць жывы агонь.

*Лічылкай выбіраюць таго, каму можна даручыць адказную справу здабыванняагню*

**Дзяўчына.**

Эна- бэна дудкі, - гаспадар малюткі,

Гаспадыня яшчэ менша, і, напэўна, разумнейша.

Села баба на барону, паехала ў госці

І нарвала траўкі,

Хто траўку знайшоў, той вон пайшоў.

*Той, каго выбралі, распачынае здабываць агонь, тручы брусы дрэва адзін абдругі.*

**Усе.**

Гары гары гарка,

Прыедзе кухарка,

Кухарка- на карове,

Кухар- на кабыле,

Цёці на цялятках,

Слугі на шчанятках.

*Спроба запаліць агонь, тручы брусы дрэва адзін аб другі не ўдалася, таму зноўлічылкай выбіраюць таго, хто будзе здабываць жывы агонь.*

**Хлопец.**

Петушок, петушок, залаты грабянёк,
На саломцы спаў, - ён рана ўстаў,
Па вадзічку пайшоў, маладзічку знайшоў,
Маладзічка дабра яму штонікі дала,
Ён і тыя не знасіў, і другія папрасіў.

*Агонь імкнуцца здабыць ударaючы камяні адзін аб другі.*

**Усе.**

Гары, гары гарка,
Прыедзе кухарка
І прывязе кока
Дай залепіць вока.

*Агонь не хоча загарацца.*

**Дзяўчына.** Як жа нам грамнічныя свечкі запаліць?

**Хлопец.** Можа нам агню ў гарэлыша папрасіць?

*Усе гуляюць у гульню "Гарэлыш"*

(глядзі Гульні.Забавы.Ігрышчы./ Склад. Лозка А.Ю. Мінск.2000.)

**Усе.**

Гары, гары ярка, прыедзе Захарка
У чырвонай шапцы - сам на лашадцы
Жана на кароўцы, дзеці на сабачках,
Казёл ў кафтане, каза ў сарафане,
Вуткі ў будке! Тараканы! Біце ў барабаны!

**Усе ўдзельнікі выконваюць танец.**

*Урэшце агонь загараецца, усе запальваюць ад яго грамнічныя свечкі.*

**Удзельнікі выконваюць песню "Святыя Грамніцы"**

**Дзяўчаты і хлопцы.** (*З'яўляюцца і кажуць па чарзе*)

-Грамаўнік!
-Грамніца!
-Стрэчанне!

*З'яўляюцца «нячысцікі».*

**Пужайла.** Хто нас клікаў? Хе-хе-хе! (*Здзекліва)*

Дзед пайшоў у грыбы, а баба ў апенькі,
Дзед свае прасушыў, а бабіны макрэнькі.

**Пужаніца.**

А дзед- дзядуленька , а дзе твая бабуленька?

**Пужайла і Пужаніца.** *(Разам).*

Нету, нету, да няма ж,- паехала на кірмаш.

А ці чорт яе панёс, не памазаўшы калёс.

**Дзяўчына.** (*Звяртаючыся да «нячысцікаў»)*Мікіта, ці ты та?

**Пужайла.** Не я то - мой тата.

**Хлопец.** Мікіціха дзяжу месіць,

**Дзяўчына.** А Мікіта чэшыць,

**Хлопец.** Мікіта дровы сячэць,

**Дзяўчына.** А Мікіціха бліны пячэць,

**Хлопец.** Сячэць дровы яловыя,

**Дзяўчына.** Пячэць бліны паловыя.

**Хлопец.** Касы заяц нанёс яец,

**Дзяўчына.** Вывеў дзяцей - касых чарцей.

*Выганяюць «нячысцікаў», каб яны не першкаджалі добрай справе.*

**Усе. (***Разам)*

Наталля, пралля,

Кузьма- вераценнік.

Пайшоў у бярэзнік,

Сабакі дагналі,

Нагу адарвалі.

**Пужайла.** (*Жаласна)*Вясна красна наступае, вадой лугі залівае,

Што не прайсці не праехаць, свайго роду не праведаць.

**Пужаніца.** *(Амаль плачыць)*Ой, вясною, за вадою, а ў лецечку - за жнівамі, а зімою за снягамі, не прайсці і не праехаць.

**Дзяўчына.** (*Супакойвае)*

Дзіця ж маё маладое, ты вясною- на чоўнічку, ты ў лецечку- у нядзелечку,

А ў зімачку ў палазочку, - такі ж роду пераведай.

**Хлопец.**

А каб прыйшлі сапраўдныя Грамаўнік і Грамаўніца трэба нам добра павесяліцца!

На возе едуць двое: Вазніца і Паніч.

**Паніч.** Во, убіў я зайца, дык з яго сала было з цэлы пуд.

**Вазніца.** Во, пане, будзем ехаць праз мост, дык там Пярун брахуноў маланкай б’е.

**Паніч.** А далека той мост?

**Вазніца.** Ды не - во за гэтым лесам, дзе горка, а там луг, а там ужо зусім блізка.

**Паніч.** Каб ты бачыў таго зайца - аднаго сала з яго было хунтаў з дзесяць.

**Вазніца.** Вось ужо той мост хутка будзе відаць.

**Паніч.** Ну, можа не дзесяць, але ж хунтаў пяць з таго зайца сала было.

**Вазніца.** Мост той зусім слабы ад маланак Грамаўніка, ня ведаю ці вытрывае мост?

**Паніч.** Ну, хоць сала на ім не было, а ўсе ж заяц быў не такі худы. А дзе ж той мост?

**Вазніца.** А разышоўся, як заечае сала.

**Дзяўчына.**

Едзіць вясна, едзіць на залатым кані
У зяленым саяні,
На сасе седзячы, сыру зямлю аручы,
Правай рукой сеючы, а смыком скародзячы.

Едуць на возе Вазніца, Пан і Пані.

**Пані.** Было гэта даўно-даўно.Сяджу аднойчы адна дома і раптам з'яўляецца стары. Я, - кажа ён, - цудатворац і магу вам сказаць, што праз некалькі хвілін у ваш дом Грамаўнік маланкай трапіць. Я перапалохалася! Што хочаш бяры, толькі зрабі, каб гэта не здарылася. І што вы думаеце - не трапіў Грамаўнік...

**Хлопец.**

Вязець, вязець вясна
Вязець, вязець красна
Ясны дзянёчкі,
Чыстыя дажджочкі,
Зялёныя травы,
Красныя квяточкі
Дзеўкам на вяночкі.

Едуць на возе Пан, Пані, Паніч, Вазніца.

**Вазніца.** Абарані, Божа, ад Перуновай маланкі, дык пастаўлю табе свечку!

**Паніч.** Вазьніца, а дзе ж ты столькі воску возьмеш?

**Вазніца.** Маўчы смаркач - абы толькі з балота выехаць...

**Удзельнікі выконваюць песню Песню «Вол бушуе...»**

**Дзяўчаты і хлопцы.** (*Клічуць па чарзе):*

-Грамаўнік!

-Грамніца!

-Стрэчанне!

*З'яўляюцца сапраўдныя Грамаўнік і Грамаўніца.*

**Пужайла і Пужаніца.** (*Спалохаўшыся).* Не ўбіце, пашкадуйце нас. Пакрыйце нашу глупасць сваім розумам.

**Грамаўніца.** Мы вас не будзем караць, калі вытрымаеце наш іспыт.

*Грамаўніца загадвае загадкі, «нячысцікі» просяць дапамогі і гледачоў*

**Загадкі:**

-Вісіць сіта, залатое, навітае. Усе яго любяць, чакаюць, убачаць адразу заплачуць(Сонца).

-Як зойдзе ў дом - не выганіш калом, а пара прыходзіць - ён і сам сыходзіць. (Прамень сонца).

-Карова бяжыць, скура ляжыць. (Вада і лёд).

-Дзед мост масціў без сякеры, без долата. (Лёд).

-Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць. (Вада).

-Бегла ліска каля ляску блізка, і не сцежкі, не дарожкі, толькі залатыя рожкі. (Маланка).

-Ляцеў птах, на ваду бах, вады не скалыхнуў, на дно патануў.(Снег).

**Песня «А ў нас сёння Стрэчанне», выконваюць усе ўдзельнікі**

# Стрэчанне
# Сцэнарый пазакласнага мерапрыемства

**Дзеючыя асобы:** дзед Янка, баба Паўліна, Маня - іх унучка, Скамарохі, Вясна, Зіма, Грамоўнік (Красавік), Баба Яга, Цыган, хлопцы, дзяўчаты, суседзі.

Карціна першая

*Пакой у вясковай хаце. Маня робіць урокі. Баба Паўліна чытае газету. У пакой уваходзіць дзед.*

**Дзед Янка.** Седзіце над кнігамі ды газетамі, а на дварэ цёпла, са стрэх капае, вясною пахне. Сапраўды, зіма з вясною страчаюцца.

**Баба Паўліна** *(адклаўшы газету ўбок).* Ой, Яначка, трэба курэй выпусціць на двор, няхай нап'юцца веснавой вадзіцы.

**Дзед Янка.** Ужо выпусціў, ці я прыкмет не ведаю. Дык певень адразу ж і павёў курэй да лужынкі, што са страхі нацякла.

**Маня** *(загарнуўшы кнігу, весела).* Хоць дзясяты клас - гэта не жартачкі, але на сёння хопіць *(складае кнігі і сшыткі).*

**Дзед Янка** *(прыслухоўваючыся).* Калі так, то ідзі на свежае паветра, галаву праветрыць.

**Маня** *(сур'ёзна).* Дзядуля і бабуля! Запрашаю вас на тэатралізаванае грамнічнае прадстаўленне.

*Выходзяць на двор.*

Карціна другая (казачная)

**1-ы скамарох.**

Добры дзень вам, добрыя людзі!

**2-і скамарох.**

Хай вам радасці прыбудзе!

**1-ы скамарох.**

Усіх на свята  запрашаем!

**2-і скамарох.**

З вясной, Грамніцамі вітаем!

**1-ы скамарох.**

Ну, то слухайце аб'яву...

**2-і скамарох.**

Абяцаем усім забаву!

**1-ы скамарох.**

Цяпер мы слова сваё скажам:
Людзей паглядзім, сябе пакажам!

**2-і скамарох.**
А народу, глянь, багата. Значыць, будзем ладзіць свята!
**1-ы скамарох.**
Пабачце, як Зімка ды з Вясною страчаюцца.
**2-і скамарох.**
Каму царства ладзіць, каму саступіць - спрачаюцца.
*Скамарохі не бачаць, што ў адчыненых весніцах іх слухае Зіма. Яна ў белым кажуху, белыхвалёнках, белай пуховай хустцы, у руках трымае белы ад "снегу" кій.*
**Зіма** *(падыходзячы бліжэй да людзей).* Добры дзень, паважаныя! Але гляджу на вас, людзі, ды дзіву даюся: гэта ж трэба з цёплых хат выйсці на халодны двор Вясну страчаць! Вой, дзівакі, расселіся на халодных лаўках, цяпла ды святла веснавога чакаюць *(смяецца).* Ці вы мяне не пазналі?
**Галасы.** Пазналі, ведаем. Ты - матухна-Зіма. Царыца над мяцеліцай-круцеліцай, над марозам траскучым.
**Зіма.** Прызналі мяне, але навошта вы слухаеце гэтых балбатуноў, якім сонца зубы нагрэла, і яны паверылі, што цёпла, вясна. Колькі дабра я вам зрабіла! Да гэтай пары вывозіце снег на поле. Вось такія ж поўныя машыны залацістага зерня будзеце вазіць восенню ў засекі. А мой снежны, калядны баль пад завіруху, мароз і жоўтую поўню няўжо забылі? *Спявае.*
Ой, Калядачкі, бліны, ладачкі,
Ой, люлі, люлі, бліны, ладачкі...
**Галасы з натоўпу.** Дзякуй!
**Скамарохі** *(выбягаючы).*
**1-ы скамарох.** Твае ласка, Зіма, не забылася!
**2-і скамарох.** У скарбонку памяці адарылася.
**1-ы скамарох.** Ой, Вясна, ты, Вёсенка, дзе падзелася?
**2-і скамарох.** Нам Зіма халодная ўсё ж прыелася!
**Зіма** *(адганяе кіем скамарохаў).* Я тут уладарка і пакуль не збіраюся саступаць нікому і ні ў чым! Зараз я вам пакажу, як не слухацца маці-Зіму. *(Гукае.)* Гэй, памочніца мая, на зямлю апусціся, перада мною хутчэй з’явіся!
*Стукае кіем аб зямлю, з’яўляецца Баба Яга з мятлою.*
**Баба Яга** *(кланяецца Зіме).*
Я над лесам ляцела - прытамілася, З горкі з’ехала - пракацілася. Па загадзе тваім з’явілася.Дык што патрабуецца ад мяне, маці-Зіма? Кажы, я слухаю.
**Зіма** *(паказваючы на людзей).* Як ні дзіва, але людзі выйшлі страчаць сястрыцу маю. З Вясною я разбяруся сама, а ты "замяці" людзей у хаты, нарабі ім добрай завірухі. Няхай сядзяць і носа не высоўваюць. Мяці! Мяці!

*Зіма кружыцца ў "снежным" танцы, а Баба Яга пачынае "месці" снег. Людзі закрываюць твары рукамі, настаўляюць каўняры, хаваюцца на ганак, аднак у хату ніхто не ўцякае.*

**Баба Паўліна** *(выносіць з хаты грамнічную свечку, падымае яе над галавою і кажа словы - зварот да Бабы Ягі).*

Знікні, ідзі, Баба Яга,
Касцяная нага!
Ідзі за вадою,
Стань за гарою,
Холад не рабі,
Снег не мяці!

*Баба Яга знікае, замятаючы за сабою снег.*
*Смех, музыка, танцы.*

**Зіма.** Ай-я-яй! Што робіцца?! Вы, мабыць, забыліся, які месяц на календары? То ж малодшанькі сынок мой Люты. Ён вам яшчэ і марозу дасць, падманным цяплом сагрэе і мяцеліцу-круцеліцу ўчыніць. Ды ўсё гэта ў адзін дзень зробіць. Надта ж удалы сынок, хоць і маленькі! Але чаму гэтак цёпла стала, ажно галава разбалелася?

*У гэты момант у веснічкі заходзіць малады, прыгожы хлопец, па-вясенняму ярка апрануты.*

**Красавік** *(кланяецца).* Добры дзень, добрыя людзі! Я - месяц Красавік, адказны за ўсе расліны на зямлі.

**Зіма** *(злосна).* Ага, мы вас не чакалі, а вы прыцягнуліся насуперак усім законам прыроды.

**Красавік** *(памяркоўна).* Мы ненадоўга прыйшлі, будзеш яшчэ ўладарыць з сынам сваім Лютым.

**Зіма** *(падазрона).* А з кім гэта вы прыйшлі?

**Красавік.** Ды з сястрыцаю вашай Вясной-красной. Трэба ж, каб вы сёння стрэліся, павіталіся, слоўцам-другім перакінуліся.

**Зіма** *(буркліва).* Ды заві ўжо, а то ад цяпла мне штосьці не па сабе: галава баліць, у сон хіліць, яшчэ зусім захварэю.

**Красавік** *(гукае).* Вясна-красна, пакажыся,
Хоць на момант усміхніся!

*У веснічкі заходзіць маладая прыгожая дзяўчына ў яркім адзенні. На яе галаве вянок з рознакаляровых кветак. Кланяецца Зіме, пасля людзям.*

**Вясна.**

Добры дзень, сястрыца Зіма!
Добры дзень, усім добрым людзям!

Я сюды ісці не збаялася,
З самім Сонейкам прывіталася.
Да сустрэчы з табой рыхтавалася:
Свята першага ледзь счакалася.
Запытаць хачу: як ты маешся,
З працаю лядовай ці спраўляешся?
**Зіма** *(ветліва).*
Хоць і рана, сястра, ты прыехала,
Усё ж паклон табе, што наведала,
Так заўжды было, як страчаліся,
Доўга нельга быць - разбягаліся.
Пайду ў снежную пярыну, адпачну ад святла, цяпла і шуму. Бывай, Вясна-красна, да наступнага свята, бывайце і вы, людзі добрыя, ды не дужа спадзявайцеся на цяпло!
*Кланяецца і выходзіць.*
*Іграе музыка, людзі танцуюць, танцуе і Вясна з Красавіком. У веснічках з'яўляецца Цыган, у руках ён трымае футра.*
**Цыган.** Дзень добры вам у двор! Як жа ў вас добра, весела, цёпла! *(Убачыўшы Вясну і Красавіка.)* Вой, вой, вачам сваім не веру: не іначай як Вясна з сваім памочнікам завітала? *(Кланяецца.) А* я думаю, чаго гэта так цёпла стала? Вось я футра скінуў, хачу прадаць.
Гэй, людзі, грошы не хавайце,
Футра амаль новае - набывайце,
Не падзёртае, не падранае,
Толькі крышачку надзяванае!
**Дзед Янка.** Якое ж яно новае, ты ж яго і летась прыносіў, дык я ўзяў гэтае футра ды ў каморы павесіў, каб зімой табе зноў вярнуць!
*Хтосьці зайграў на гармоніку. Цыган і некалькі пар пайшлі танцаваць. Вясна і Красавік непрыкметна зніклі, і адразу ж пахаладала.*
**Баба Паўліна** (*Цыгану).* То давай ужо футра, аднясу ў камору, забярэш пасля.
**Цыган.** Гаспадынька, дарагая, паважаная, я перадумаў прадаваць адзежыну - холадна. *(Апранае футра.)*
*Гледачы і ўдзельнікі свята сыходзяць са двара.*
*Выходзяць скамарохі.*
**1-ы скамарох.** Вось і зноў пахаладала.
**2-і скамарох.** Зіма холаду нагнала.
**1-ы скамарох.** Нашай казачцы - канец.
**2-і скамарох.** Хто глядзеў - той маладзец!